ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

УПРАЎЛЕННЕ НАРОДНА-ГАСПАДАРЧАГА ЎЧОТА БССР

ДЛЯ СЛУЖБОВАГА КАРЫСТАННЯ

ІНФАРМАЦЫЙНЫ БЮЛЕТЭНЬ

№ 7 (69)

ЛІПЕНЬ 1938 г.



ВЫДАННЕ УНГУ БССР
МЕНСК — 1938

ІНФАРМАЦЫЙНЫ БЮЛЕТЭНЬ

УПРАЎЛЕННЯ НАРОДНА-ГАСПАДАРЧАГА ЎЧОТА БССР

№ 7 (69)

ЛІПЕНЬ 1938

ПАДРЫХТОЎКА ДА ЎСЕСАЮЗНАГА ПЕРАПІСУ НАСЕЛЬНІЦТВА 1939 года

ЦИРКУЛЯР № 40

Начальникам УНХУ союзных республик

Копия: начальникам УНХУ АССР, краев и областей

В связи с тем, что программа и порядок всесоюзной переписи населения 1939 года Совнаркомом СССР еще не утверждены, сообщенные в календарном плане (в циркуляре № 36) сроки исполнения указанных ниже подготовительных работ к переписи населения изменяются:

1) работа курсов для начальников УНХУ и МБ переписи населения в Москве и областных, краевых и республиканских курсов для районных и участковых инспекторов нархозучета;

2) составление и утверждение республиканских, областных и районных оргпланов;

3) сдача техминимума работниками МБ переписи населения;

4) печатание, рассылка в области и перевод на национальные языки инструментария переписи и материалов для массово-раз'яснительной работы.

Вновь установленные сроки исполнения этих работ сообщим дополнительно после утверждения правительством программы и организационных вопросов переписи населения 1939 года.

Основное внимание в настоящее время УНХУ союзных республик, автономных республик, краев и областей должны обратить на уточнение списков населенных мест и списков домовладений *в части полноты учета населенных мест, домовладений и населения и привести в соответст-*

вие с выверенными списками картографические материалы. Необходимо, чтобы к моменту составления оргпланов в каждом районе и в каждом городе имелись вполне выверенные данные о числе населения, уточненные карты и планы.

Обсудив замечания местных УНХУ по проекту составления оргпланов (циркуляр 28), ЦУНХУ предполагает установить следующий порядок составления и утверждения оргпланов:

1. Через два дня после постановления правительства Союза ССР о порядке переписи, ЦУНХУ рассылает указания и нормативы для составления оргпланов союзным республикам.

2. УНХУ союзных республик, имеющих областное деление, через 2 дня после получения указаний ЦУНХУ, рассылают указания и нормативы краям, областям и АССР.

3. УНХУ союзных республик, не имеющих областного деления, через 5 дней после получения указаний ЦУНХУ, а также УНХУ областей, краев и АССР через 5 дней после получения указаний УНХУ союзных республик, рассылают указания и нормативы районам и горсоветам областного (краевого, республиканского) подчинения.

При этом УНХУ обязывают рай(гор.)инспекторов совместно с участковыми инспекторами, в течение 6—10 дней после получения указаний составить и выслать по почте в УНХУ проект конкретной разбивки района на переписные отделы, инструкторские и счетные участки, т. е. выслать заполненные формы №№ 1—7 районного оргплана (без приложения к форме № 2).

В это же время областные, краевые, республиканские бюро переписи населения прорабатывают переписное районирование непосредственно в УНХУ по имеющимся материалам, но окончательно число и состав переписных отделов, инструкторских и счетных участков по каждому району и городу УНХУ устанавливают лишь после получения материалов переписного районирования от райинспекторов.

Все прочие разделы областного (краевого) оргплана составляются на основании имеющихся материалов непосредственно в УНХУ.

4. Утверждаются областнные, краевые и республиканские (автономных республик) оргпланы УНХУ союзной республики по устанавливаемому им календарному плану. Оргпланы союзных республик, не имеющих областного деления, представляются на утверждение в ЦУНХУ; союзные республики, имеющие областное деление, представляют в ЦУНХУ подробные отчеты об итогах утверждения областных (краевых) оргпланов.

5. Районные оргпланы утверждаются после утверждения в УНХУ союзной республики областного (краевого) оргплана, а по союзным республикам, не имеющим областного деления,—после утверждения республиканского оргплана в ЦУНХУ. Никаких изменений в утвержденные областные (краевые, республиканские) оргпланы при утверждении районных оргпланов вносить без разрешения вышестоящего УНХУ нельзя.

В виду того, что сроки составления оргпланов будут непродолжительными, УНХУ областей, краев и республик уже сейчас должны подготовить все необходимые для составления оргпланов материалы: списки станций, портов, авиапортов, больниц, детских домов, санаториев, домов инвалидов, родильных домов, гостиниц, домов крестьянина, постоялых дворов с указанием числа населения в них и др. материалы.

Сейчас уже нужно получить все необходимые сведения о проходящих по территории области (края, республики) поездах дальнего следования. Ответственными за расчеты переписного персонала для переписи пассажиров в поездах дальнего следования являются УНХУ тех областей, краев и республик, на территории которых находятся управления железных дорог (ведущие УНХУ). Эти УНХУ должны выяснить в управлении железной дороги перечень поездов, проходящих по данной дороге в период от 23 часов до 1 часа ночи, число мест в этих поездах (мягких, плацкартных, неплацкартных) и согласовать с Управлением дороги станцию посадки переписной бригады для каждого поезда.

Перепись пассажиров в поездах железных дорог будет производиться от 23 часов до 1 часа ночи, поэтому ведущие УНХУ должны наметить такую станцию посадки переписной бригады, через которую поезд проходит около 23 часов ночи.

№№ поездов, число мест в поездах и станцию посадки переписной бригады для каждого поезда, ведущее УНХУ должно сообщать для включения в оргплан УНХУ той области (края или республики), на территории которой находятся станции посадки.

ЦУНХУ предупреждает все республики, края и области, что к составлению оргпланов можно приступить только после получения соответствующих указаний ЦУНХУ.

Зам. начальника Центрального Управления Народно-хозяйственного учета при Госплане СССР Бозин.

Нач. оргсектора Бюро всесоюзной переписи населения Шмыков.

10 июня 1938 года.

ИНСТРУКЦИЯ

по составлению списка предприятий и учреждений (для районного и городского инспектора)

1. Порядок составления списков предприятий и учреждений для шифровки материалов переписи 1937 года совершенно не обеспечивал полноты и качества списков. Последнее оказало отрицательное влияние на разработку материалов переписи 1937 года.

2. Для того, чтобы обеспечить исчерпывающую полноту списков, необходимых для разработки переписных листов переписи 1939 года, устанавливается порядок, при котором каждый районный и городской инспектор по своему району и городу на основании настоящей инструкции, составляет исчерпывающий список предприятий и учреждений.

3. Районный и городской инспектор по получении инструкции к составлению списков предприятий и учреждений и необходимого количества бланков созывает совещание участковых инспекторов, на котором проводит инструктирование о порядке составления списков предприятий и учреждений.

4. Одновременно районный и городской инспектор разрабатывает план работ и устанавливает для каждого участкового инспектора точный график работ.

5. В период составления списков инспектор обязан систематически наблюдать за работой участковых инспекторов, особенно на слабых участках. В тех городах, где нет участковых инспекторов, составление списков проводится аппаратом горинспектуры.

6. Наряду с составлением списков участковыми инспекторами районный и городской инспектор обязан подобрать и привести в порядок весь имеющийся у него материал по спискам предприятий и учреждений (списки предприятий для переписи соцпромышленности на 1/I 1938 г., единовременного учета труда и зарплаты, списки строек, совхозов, МТС, МТМ, колхозов и т. п.), а также получить дополнительный материал во всех районных организациях, организациях по лесозаготовкам и т. д., о всех ликвидированных и вновь возникших предприятиях и учреждениях.

7. Списки участковыми инспекторами составляются по с/советам. В списки заносятся все предприятия и учреждения, находящиеся в пределах каждого с/совета, *за исключением предприятий наркоматов тяжелой, оборонной и машиностроительной промышленности и других специальных об'ектов.*

8. Особое внимание необходимо обратить на то, чтобы в список обязательно были внесены:

а) все часто встречающиеся однотипные предприятия и учреждения (школы, больницы, торговые точки, столовые, буфеты, парикмахерские и т. п.);

б) все вспомогательные предприятия различных учреждений и предприятий, хотя-бы сами учреждения, имеющие в городе или районе вспомогательные предприятия, находились за пределами района или города;

в) все предприятия, принадлежащие промысловой и инвалидной кооперации.

9. Список предприятий и учреждений районными и городскими инспекторами составляется по следующей форме:

ЦУНХУ
при Госплане СССР.

Всесоюзная перепись
населения.

СПИСОК ПРЕДПРИЯТИЙ И УЧРЕЖДЕНИЙ

Республика, край, область ____________

Район ____________ Город ____________

Сельсовет ____________

№№ по пор.	Наименование предприятия, учреждения	Род изготовляемых изделий, характер деятельности (если не видно из названия)	Наименование наркомата или ведомства, к которому относится предприятие или учреждение	Наименование организации, которой непосредственно подчинено данное предприятие или учреждение	Адрес: населенный пункт (для сельских предприятий). Ул., милицейский № и № телефона (для городских)
1	2	3	4	5	6

10. Наименование предприятия и учреждения, совхоза и т. д. должно записываться полностью без всяких сокращений.

Наряду с названием предприятия необходимо указывать род производства. Нельзя писать „Красная заря", „Пролетарий", необходимо писать: „Ткацкая фабрика. „Красная заря", „Механический завод „Пролетарий", „Мельница № 42", „Районный земельный отдел (райЗО)", „Районная инспектура народно-хозяйственного учета (РИНХУ)". Если предприятие принадлежит совхозу или колхозу, необходимо указывать род предприятия и название совхоза или колхоза, которому принадлежит предприятие. Например, „Электростанция совхоза „Гигант", „Парикмахерская колхоза „Свободный путь". Если предприятие или учреждение

имеет несколько наименований (сокращенное, местное), необходимо, помимо официально присвоенного названия, в скобках указать и другие названия.

При записи стройки нельзя писать название строительной организации, ведущей строительство; необходимо записать точное название самой стройки, например, „Строительство лесопильного завода „Коминтерн".

11. При внесении в список артелей промысловой и инвалидной кооперации, об'единяющих несколько предприятий с различными производствами, необходимо каждое из этих предприятий записывать отдельной строкой с обозначением в гр. 3 рода изготовляемых изделий и в гр. 6 адреса.

Кроме того, до перечисления отдельных предприятий, необходимо отдельной строкой внести название этой артели (прочеркнув гр. 3, 4 и 5 списка).

Запись в списке подобной сложной артели будет иметь, примерно, следующий вид:

№№ по пор.	Наименование предприятия, учреждения	Род изготовляемых изделий, характер деятельности (если не видно из названия)	Наименование наркомата или ведомства, к которому относится предприятие или учреждение	Наименование организации, которой непосредственно подчинено данное предпр. или учреждение	Адрес
	„XV лет Октября" артель	—	—	—	Ул. Калинина, 15
	„XV лет Октября" артель	Кирпичн. пр-во	—	—	Б. Луговая, 35
	„XV лет Октября" артель	Пр-во гончарн. посуды	—	—	Б. Луговая, 35
	„XV лет Октября" артель	Войлочн. пр-во	—	—	Московская, 49
	„XV лет Октября" артель	Канатно-веревочн. пр-во	—	—	Ул. Калинина, 15

12. В гр. 3 списка необходимо указывать для промышленных предприятий, какие оно вырабатывает изделия, либо характер его деятельности.

Последнее необходимо в тех случаях, когда по названию предприятия нельзя определить род его производства или характер его деятельности и когда нет специальных причин, не позволяющих делать таких указаний. Например,

„Артель им. 1 Мая". В этом случае в гр. 3 необходимо указать: „шитье одежды", „ремонт обуви", „столовая" и т. п.

13. В гр. 4 указывается название наркомата или ведомства, к которому относится предприятие или учреждение. Например: „Механический завод „Пролетарий", в гр. 4 отметить „Наркомместпром"; „Электростанция совхоза „Гигант" — Наркомсовхозов"; „Мельница № 42—„Союзмука", „Больница им. проф. Боткина—Наркомздрав".

14. В гр. 5 указывается название организации, которой непосредственно подчинено данное предприятие или учреждение. Например: „Механический завод „Пролетарий"— в гр. 5 отметить „Облместпром"; Мельница № 42—„Облсоюзмука"; „Больница им. проф. Боткина—Райздрав".

15. Для того, чтобы при составлении списка не было пропущено ни одно предприятие, при этом прилагается примерный схематический перечень предприятий и учреждений, которые при наличности их в пределах района или города, должны быть внесены в список (см. приложение 1).

16. Основное требование, которое пред'является к списку предприятий и учреждений, это исчерпывающая полнота списка с тем, чтобы в список были внесены все без исключения предприятия.

С внешней стороны списки должны составляться аккуратно, чисто и четко. Они обязательно должны быть написаны чернилами.

Никакие отступления от установленной формы списка не допускаются.

Списки предприятий и учреждений должны быть подписаны участковым инспектором.

17. По мере поступления заполненных по с/советам списков от участковых инспекторов, районный инспектор тщательно сверяет их со всеми, имеющимися в его распоряжении источниками (списки промпредприятий для учета соцпромышленности на 1/I—38 г., единовременного учета труда и зарплаты, списки совхозов, коопхозов, МТС, МТМ и их предприятий и т. п.) и в случаях небольших расхождений вносит в них все необходимые изменения и дополнения.

18. В случае больших пропусков или неправильностей в списке, составленном участковым инспектором, районный инспектор поручает выправить их участковому инспектору.

19. По окончании работ по составлению списков, городской и районный инспектор подписывает их и высылает в бюро переписи населения республиканского, областного, краевого УНХУ.

ЗАГАД № 322

па Ўпраўленню народна-гаспадарчага ўчота БССР

ад 3 чэрвеня 1938 г.

§ 1.

За зрыў падрыхтоўчых работ да ўсесаюзнага перапісу насельніцтва і складанне вочкаўцірацельскіх актаў аб праверцы пагаспадарчых кніг па Чэрвеньскаму і Бельскаму сельсоветах—участковага інспектара НГУ Дрыбінскага раёна т. Аўласенка зняць з работы з 25 красавіка г/г.

Прапанаваць райінспектару т. Ракецкаму матэрыял перадаць пракуратуры для прыцягнення Аўласенка да адказнасці.

§ 2.

Участковаму інспектару НГУ Дрыбінскага раёна т. Жураўлёву П. Ф. за невыкананне ў тэрмін работ па падрыхтоўцы да перапісу насельніцтва, наяўнасць дэфектаў у пагаспадарчых кнігах па сельсоветах і невыкананне загада УНГУ БССР ад 10/IV г. г. за № 213 аб пераездзе на свой участак—абвясціць суровую вымову з папярэджаннем.

Прапанаваць т. Жураўлёву да 15 чэрвеня г. г пераехаць у цэнтр свайго ўчастка—у Суслаўскі сельсовет.

В. а. начальніка Ўпраўлення Наргасучота БССР Абудзееў.

Начальнікам абласных упраўленняў наргасучота

З паступіўшых квартальных спісаў домаўладанняў і квартальных планаў гор. Оршы выяўлена парушэнне інструкцыі ЦУНХУ аб парадку складання квартальных спісаў домаўладанняў (гл. бюлетэнь № 13, снежань 1937), выразіўшаеся ў тым, што ў гр. 5 „лік усіх будынкаў" уключаны толькі жыллёвыя будынкі, а не ўсе будынкі жыллёвыя, і нежыллёвыя, як гэтага патрабуе інструкцыя.

Бюро перапісу насельніцтва УНГУ БССР прапануе праверыць правільнасць складання квартальных спісаў домаўладанняў і квартальных планаў гарадоў і горпаселішч па вашай вобласці, патрабуючы ад горрайінспектароў строгага захоўвання інструкцыі.

Аб выніках праверкі просім паведаміць бюро перапісу насельніцтва УНГУ БССР.

Начальнік бюро перапісу насельніцтва УНГУ БССР Каштанаў.
Эканаміст Бутрымовіч.

1 ліпеня 1938 г. № 04.

Начальнікам абласных упраўленняў, раённым і гарадскім інспектарам наргасучота

Змяшчаючы ніжэй указанні, дадзеныя *Менскім* абласным упраўленнем наргасучота *9 мая* г. г. райінспектарам наргасучота Менскай вобласці аб арганізацыі тэхвучобы па пытаннях перапісу насельніцтва, рэкамендуем вам скарыстаць прапанаваны Менскім абл. УНГУ парадак і метад правядзення тэхвучобы ў сябе.

„Згодна ўказання бюро перапісу насельніцтва ЦУНХУ ўсе работнікі сістэмы наргасучота па перапісу насельніцтва павінны будуць здаць залікі па тэхмінімуму. На падставе ўказання ЦУНХУ для прапрацоўкі вам пасылаецца брашура „Перепись населения в капиталистических странах" проф. А. Я. Баярскага.

Прапрацоўка павінна быць арганізавана неадкладна з разлікам, каб паказаная брашура была прапрацавана да 15 чэрвеня, пасля чаго, вам будзе выслан для прапрацоўкі дадатковы матэрыял. Для заняткаў адвядзіце поўнасцю 1 дзень у тыдзень з абавязковым наведваннем усімі работнікамі раённай і ўчастковай інспектуры."

Прапрацоўку паказанай брашуры рэкамендуецца арганізаваць наступным чынам:

1-ыя заняткі:	а) Кароткая гісторыя перапісаў насельніцтва б) Перыядычнасць перапісаў в) Сувязь перапісаў з другімі абследаваннямі г) Час перапісу д) Катэгорыя ўлічваемага насельніцтва	стар. 3—24
2-ія „	а) Адзінка ўчота і сістэма бланкаў б) Метад перапісу в) Ход аперацыі	стар. 24—47
3-ія „	а) Падрыхтоўчая работа і разбіўка тэрыторыі б) Камплектаванне шчотчыкаў в) Інструктаж г) Адказнасць за парушэнне правіл перапісу і сакрэтнасць даных перапісу. д) Прапаганда перапісу	стар. 47—58
4-ыя „	а) Змест праграмы перапісаў	стар. 58—89

З атрыманнем гэтага складзіце календарны план занняткаў. У плане павінны быць указаны: дзень і гадзіны занняткаў, прапрацоўваемыя тэмы і месца правядзення занняткаў.

Календарны план 14 мая прадстаўце ў Абласное бюро перапісу насельніцтва.

Заняткі рэкамендуем праводзіць наступным метадам:

На першых занятках неабходна прачытаць і распрацаваць калектыўна першую тэму занняткаў. У перыяд да другога разу кожны работнік гэту тэму прапрацоўвае самастойна. На чарговых занятках райінспектар прапануе ўдзельнікам занняткаў зрабіць невялікія даклады па асобных пытаннях тэмы. Пасля гэтага шляхам калектыўнай чыткі і разбора прапрацоўваецца наступная тэма.

Райінспектар абавязан завесці дзеннік учота наведвання работнікамі занняткаў з ацэнкай якасці прапрацовак кожнай тэмы кожным работнікам раённай і ўчастковай інспектуры".

Райінспектарам наргасучота Палескай вобласці

Праверка спісаў населеных месц, спісаў домаўладанняў і завядзення пагаспадарчых кніг праходзіць нездавальняюча.

Пасля рэспубліканскай нарады, райінспектары наргасучота ніякіх вынікаў з становішча падрыхтоўчых работ да перапісу насельніцтва не зрабілі і мер для недапушчэння грубейшых памылак не прынялі.

Недаўчот гаспадарак, насельніцтва і домаўладанняў яшчэ мае месца ў радзе выпадкаў і пасля суцэльнай праверкі.

Праверка спісаў домаўладанняў, населеных месц і завядзення пагаспадарчых кніг праводзіцца без прыцягнення грамадскасці, не гледзячы на тое, што на рэспубліканскай нарадзе па гэтаму пытанню былі дадзены яскравыя ўказанні.

Па раду раёнаў з боку асобных участковых інспектароў суцэльная праверка падмяняецца выбарачнай праверкай, груба парушаюцца інструкцыйныя ўказанні.

З боку райінспектароў адсутнічае кантроль за правядзеннем работ па праверцы спісаў домаўладанняў, населеных месц і завядзення пагаспадарчых кніг, а таксама наглядаецца недысцыплінаванасць, якая праяўляецца ў тым, што справаздачы аб ходзе падрыхтоўкі да перапісу насельніцтва дасылаюцца ў бюро перапісу УНГУ БССР і абл. УНГУ неакуратна.

Згодна ўказання ЦУНХУ тэрмін заканчэння праверкі населеных месц і спісаў домаўладанняў працягнуты да 20-га ліпеня.

Дасылаючы пры гэтым календарны план работ райінспектур па заканчэнню суцэльнай праверкі населеных месц, спісаў домаўладанняў і завядзення пагаспадарчых

кніг, абавязваю вас прыняць усе меры да таго, каб паказаныя работы былі абавязкова скончаны ў вызначаныя тэрміны, пакольні абл. УНГУ к 20 ліпеня павінна мець поўную зводку па вобласці аб зменах у выніку праверкі (лік выяўленых населеных пунктаў, гаспадарак, домаўладанняў і насельніцтва).

Прапаную вам на падставе дасылаемага плана работ скласці календарныя планы работ для кожнага ўчастковага інспектара па правядзенню суцэльнай праверкі і ўзяць гэту работу пад свой асабісты нагляд і кантроль.

Зварачваю вашу ўвагу на тое, што пры правядзенні суцэльнай праверкі спісаў населеных месц і домаўладанняў, а таксама праверкі завядзення пагаспадарчых кніг павінна выконвацца наступнае:

1. Пры правядзенні суцэльнай праверкі па сельсовету і гораду прыцягваць грамадскасць, арганізуючы вылучэнне праз прэзідыумы горсоветаў і сельсоветаў спецыяльных брыгад з лепшых актывістаў.

2. Па сканчэнні праверкі па населеных пунктах сельсовета або горада абмеркаваць на нарадзе брыгады вынікі праверкі з пункту погляду паўнаты ўчота гаспадарак і ўсяго насельніцтва, а таксама далажыць вынікі праверкі прэзідыуму горсовета або сельсовета.

3. Сістэматычна інфарміраваць райкомы КП(б)Б і РВК аб ходзе праверкі па кожнаму сельсовету.

4. Праверыць, наколькі ўчастковыя інспектары засвоілі інструкцыю па складанню домаўладанняў і спісаў населеных месц.

Начальнік Палескага абласнога УНГУ **Фішкінд.**

24 чэрвеня 19**38** г.

З пісьма начальніка Палескага абласнога УНГУ ад 20 чэрвеня 1938 г. на імя райінспектароў наргасучота Палескай вобласці

Падкрэсліваю, што асноўнымі задачамі ў падрыхтоўцы да перапісу насельніцтва зараз з'яўляюцца:

1. Поўнае сканчэнне суцэльнай праверкі спісаў населеных месц і домаўладанняў, а таксама завядзення пагаспадарчых кніг у сельсоветах.

Пры суцэльнай праверцы спісаў домаўладанняў і населеных месц, па дамоўленасці з мясцовымі органамі, неабходна ўдакладніць, дзе перапіс будзе праводзіцца ў асобым парадку (органамі НКВД і БВО),—устанавіць граніцы ўчасткаў.

2. Падрыхтоўка ўсяго картаграфічнага матэрыяла (карты раёнаў, планы гарадоў, планшэты сельсоветаў) згодна ўказанняў бюро перапісу УНГУ БССР.

3. Складанне спісаў устаноў і арганізацый, дзе перапіс будзе праводзіцца ў асобым парадку (згодна пісьма бюро перапісу насельніцтва УНГУ БССР ад 3 чэрвеня 1938 г.).

4. Складанне спісаў усіх станцый, партоў і авіяпартоў у адпаведнасці з цыркулярам №40 ЦУНХУ.

5. Праверка населеных пунктаў, мяжуючых з другімі раёнамі.

6. Учот асоб, з якіх могуць камплектавацца кадры для перапісу насельніцтва.

Паведамляючы аб гэтых асноўных і рашаючых работах па падрыхтоўцы да перапісу насельніцтва на даны перыяд, абавязваю вас персанальна ўзяць пад свой асабісты нагляд і кантроль ход і выкананне ўсіх гэтых работ.

Аб ходзе выканання работ інфарміруйце бюро перапісу насельніцтва УНГУ БССР і абл. УНГУ.

ЗАГАД № 38

па Магілеўскаму абласному ўпраўленню наргасучота

28 чэрвеня 1938 г.

Пры праверцы мною хода падрыхтоўчых работ да ўсесаюзнага перапісу насельніцтва па Круглянскаму раёну ўстаноўлена, што ўчастковы інспектар Круглянскага раёна т. Гуркоў пасля праверкі правільнасці запаўнення пагаспадарчых кніг у Нова-Палескім с/совеце, Круглянскага раёна, даваў няправільныя звесткі аб прапушчаных у час першага ўчота гаспадарках і насельніцтве, у прыватнасці па аднаму населенаму пункту—Нова-Палессе—Гурковым прадстаўлены райінспектуры УНГУ звесткі, што прапушчана была адна гаспадарка і адзін чалавек, а мною ўстаноўлена, што прапушчана было тры гаспадаркі і адзінаццаць чалавек насельніцтва.

Акрамя таго, участковы інспектар Гуркоў пасля праверкі с/совета склаў акт, у якім указаў, што па Нова-Палескаму с/совету поўнасцю заведзены журналы калгасаў па форме № 1, спіс па форме № 4 і, што ўвесь пярвічны ўчот у с/совеце адпавядае ўсім патрабаванням, а пры праверцы мною ўстаноўлена, што журналы калгасаў зусім не заведзены, спіс па форме № 4 таксама не заведзен, гаспадаркам сталыя нумары не дадзены. Па калгасніках не адзначан год уступлення ў калгас; па рабочых і служачых не адзначана месца работы і пасады, алфавіт не заведзен.

Адзнакі аб механічным і натуральным руху насельніцтва ў кнігах не робяцца.

У кнігах улічаны асобы, якія па 12 год не пражываюць у с/савеце, а на некаторыя гаспадаркі не заведзены асабовыя рахункі. Жывёла ў гаспадарках разнесена была не на падставе спісаў парапісу жывёлы, а апытаннем у час завядзення пагаспадарчых кніг.

Усё гэта сведчыць аб выключна безадказнай рабоце ўчастковага інспектара Гуркова і адсутнасці кантроля за работай участковых інспектароў з боку райінспектара НГУ т. Бекешко.

Выходзячы з гэтага, загадваю:

1. За безадказныя адносіны да суцэльнай праверкі пагаспадарчых кніг с/савета і дачу зусім няправільнага заключэння аб становішчы пярвічнага ўчота ў с/савеце— участковаму інспектару Круглянскага раёна Гуркову абвяшчаю суровую вымову.

2. Указваю райінспектару НГУ Круглянскага раёна т. Бекешко на адсутнасць з яго боку кантроля за работай участковых інспектароў і прапаную неадкладна забяспечыць выпраўленне выяўленых праверкай недахопаў па ўчоту насельніцтва і вядзення пярвічнага ўчота ў Нова-Палескім с/савеце.

3. Папярэджваю ўсіх раённых і ўчастковых інспектароў, што асноўная ўвага ў рабоце па праверцы с/савецкіх кніг павінна быць звернута на якасць гэтай праверкі з тым, каб усе гаспадаркі і ўсё насельніцтва былі поўнасцю ўлічаны, і на правільнае запаўненне кніг па астатніх раздзелах, а таксама звярнуць асаблівую ўвагу на правільнасць падлікаў насельніцтва, гаспадарак і будынкаў, пры пераняcенні з кніг у спісы населеных месц.

В. а. начальніка Магілеўскага абласнога УНГУ Леўковіч.

ЗАГАД

па Віцебскаму абласному УНГУ

ад 20/VI 1938 г.

Праведзеная праверка некаторых райінспектур па пытаннях хода падрыхтоўчых работ да ўсесаюзнага перапісу насельніцтва і правядзення заключнай справаздачы па сяўбе паказала:

1. Асобныя райінспектары (Асвея, Багушэўск, Ліёзна) справу падрыхтоўчых работ да перапісу пусцілі на самацёк, не арганізавалі работу па суцэльнай праверцы спісаў населеных месц і спісаў домаўладанняў.

2. Па Асвейскаму раёну на 15/VI праверка праведзена толькі ў 2-х сельсоветах, што прывяло да прамога зрыва гэтага мерапрыемства райінспектарам Стрэльчанка.

3. Некаторыя раёны (Сенно, Ліёзно, Ушачы) не дасылаюць інфармацыйных справаздач аб ходзе падрыхтоўкі да перапісу насельніцтва, чым зрываецца справаздача па вобласці.

4. Не гледзячы на нашы ўказанні ад 15-га мая па арганізацыі брыгад садзейнічання перапісу насельніцтва, аб чым таксама маецца зварот ЦК СРДУ, да выканання данага ўказання прыступілі толькі пяць раёнаў.

5. Па ўчоту пасеўных плошчаў Асвейскі раён (інспектар Стрэльчанка) дапусціў недапушчальную безадказнасць: не толькі сарваў своечасовае правядзенне інструктажа, а нават займаецца вочкаўцірацельствам, указваючы, што інструктаж па Задзеждзенскаму і Малашынскаму с/советах быў праведзен. Пры праверцы-ж устаноўлена, што ніякага інструктажа не праводзілася.

Усё гэта сведчыць аб адсутнасці дысцыпліны ў райінспектурах, а таксама недастатковай рабоце з участковымі інспектарамі, недаацэнцы падрыхтоўчых работ да перапісу і да заключнай работы па сяўбе.

Выходзячы з гэтага, з а г а д в а ю:

1. За зрыў праверкі спісаў населеных месц, неправядзенне інструктажа па падрыхтоўчай рабоце да перапісу насельніцтва і заключнай па сяўбе райінспектару Асвейскага раёна Стрэльчанка абвяшчаю суровую вымову з папярэджаннем, прычым, калі неадкладна не будуць выпраўлены дапушчаныя недахопы ў рабоце, прыму меры аж да зняцця з работы і аддачы пад суд.

2. За непрадстаўленне справаздачы на 15/VI аб падрыхтоўцы да перапісу насельніцтва райінспектарам Сенненскага раёна Гарбачову і Ушачскага раёна Міліну стаўлю на від.

Папярэджваю ўсіх райінспектароў Віцебскага абл. УНГУ, што ў выпадку незабеспячэння прадстаўлення нам да 1-га і 15-га числа штомесячнай справаздачы аб ходзе падрыхтоўкі да перапісу, альбо ў выпадку спазнення ў прадстаўленні нам справаздачы, буду гэта ўлічваць як прамы зрыў мерапрыемстваў перапісу з усімі выцякаючымі з гэтага вынікамі.

3. Райінспектарам неадкладна выканаць дырэктывы абл. бюро перапісу па арганізацыі брыгад садзейнічання, складання спісаў устаноў закрытага тыпа, складанню спіса ўсіх устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый раёна, аб тэрытарыяльным складзе гарадоў і горпаселішчаў, аб устанаўленні аб'ектаў, дзе перапіс будзе праводзіцца ў асобым парадку (органамі Б.В.О і НКВД).

4. Прапаную ў далейшым ні ў якім выпадку не паслабляць работу па суцэльнай праверцы спісаў населеных месц і домауладанняў „з прычыны ўліку пасеўных плошчаў“, і адначасова забяспечыць выкананне ўсіх работ.

В. а. начальніка УНГУ па Віцебскай вобласці Селедцоў.

ПАСТАНОВА

прэзідыума Глускага раённага выканаўчага камітэта

ад 13-га чэрвеня 1938 г.

Аб выніках праверкі запаўнення пагаспадарчых кніг сельсовецкага ўчота

Заслухаўшы інфармацыю інспектара НГУ тав. Тумашыка, прэзідыум РВК адзначае, што запаўненне пагаспадарчых кніг сельсовецкага ўчота па раду сельсоветаў праведзена дрэнна, маюцца выпадкі пропускаў асобных гаспадарак і насельніцтва: Сіманавіцкі с/совет—прапушчана 10 гаспадарак з лікам насельніцтва 47 чалавек; Макавіцкі с/совет—па вёсцы Калюга прапушчана 4 гаспадаркі з лікам насельніцтва 21 чалавек, па вёсцы Ольніца—4 гаспадаркі з лікам насельніцтва 13 чалавек; Казловіцкі с/совет—прапушчана 5 гаспадарак з лікам насельніцтва—23 чалавекі. Акрамя гэтага па Ляскавіцкаму, Сіманавіцкаму, Бярозаўскаму і Казловіцкаму сельсоветах і да гэтага часу ў пагаспадарчых кнігах не разнесена жывёла, што з'яўляецца прамым зрывам правядзення ўчота аб'ектаў абкладання. Прэзідыум РВК такое становішча з запаўненнем кніг сельсовецкага ўчота па адзначаных с/саветах расцэньвае ні чым іншым як безадказнымі адносінамі старшынь і сакратароў гэтых с/советаў да справы запаўнення кніг сельсовецкага ўчота. У мэтах ліквідацыі адзначаных недахопаў, прэзідыум РВК пастанаўляе:

1. Абавязаць старшынь усіх с/советаў і асабліва старшынь Сіманавіцкага, Казловіцкага і Макавіцкага с/советаў неадкладна выправіць выяўленыя праверкай недахопы і забяспечыць не пазней 20-га чэрвеня г. г. поўнасцю запаўненне ўсіх граф у кнігу сельсовецкага ўчота.

2. Прапанаваць старшыням с/советаў, у якіх яшчэ не праведзена праверка запаўнення пагаспадарчых кніг, вылучыць з сельсовецкага актыва па 5—6 чалавек у дапамогу ўчастковым інспектарам НГУ для выканання гэтай работы.

3. На чарговым паседжанні прэзідыума РВК заслухаць інспектара НГУ т. Тумашыка аб становішчы пярвічнага сельсовецкага ўчота па раёну і аб ходзе падрыхтоўкі да

надыходзячага перапісу насельніцтва з выклікам па гэтых пытаннях старшынь Клетнянскага і Ляскавіцкага с/советаў.

4. Указаць заг. Комунаддзела т. Рысіну на невыкананне пастановы прэзідыума РВК ад 3/II—38 г. у адносіне ўпарадачэння нумарацыі дамоў і назваў вуліц, абавязаўшы яго ў дэкадны тэрмін закончыць гэту работу.

Соцумова

Мы, райінспектары наргасучота Палескай вобласці, улічваючы ўсю важнасць пастаўленых зараз перад органамі наргасучота задач, маючых выключна важнае палітычнае і гаспадарчае значэнне, як падрыхтоўка да перапісу насельніцтва, учот пасеўных плошчаў, вызначэнне відаў на ўраджай, вымярэнне ўраджая на корані і інш., бярэм на сябе наступныя абавязацельствы:

1. Учот пасеўных плошчаў правесці на „выдатна" і своечасова, для чаго неадкладна разгарнуць падрыхтоўчую работу, а менавіта:

а) шырока разгарнуць сярод насельніцтва масава-растлумачальную работу аб задачах і значэнні ўчота пасеўных плошчаў;

б) асабіста і праз участковых інспектароў праверыць наяўнасць складзеных актаў прыёмкі пасеваў у калгасах і дабіцца неадкладнай прыёмкі і абмера пасеваў у натуры ў тых калгасах, дзе гэта работа яшчэ не скончана;

в) неадкладна скласці з сельсовецкага і калгаснага актыва брыгады садзейнічання ўчота пасеўных плошчаў, забяспечыўшы іх поўным кіраўніцтвам з боку раённага і ўчастковых інспектароў наргасучота;

г) праверыць правільнасць прыёмкі ўч. інспектарамі матэрыялаў па ўчоту пасеўных плошчаў не менш чым у 15 проц. калгасах.

2. Усе работы, звязаныя з вызначэннем ураджайнасці (віды на ўраджай, вымярэнне ўраджаю на корані, выяўленне страт і іншыя кантрольныя работы) правесці ва ўстаноўленыя тэрміны і на „выдатна", забяспечыўшы поўны ахоп вызначаных калгасаў па кожнаму віду работ і праверку работы ўчастковых інспектароў непасрэдна ў калгасах.

3. Забяспечыць высокую якасць і своечасовае правядзенне падрыхтоўчых работ да перапісу насельніцтва, а менавіта:

а) праверыць ва ўсіх сельсоветах завядзенне пагаспадарчых кніг і дабіцца такога становішча, каб не было пропуска гаспадарак і насельніцтва;

б) праверыць спісы населеных месц і схематычныя карты, забяспечыўшы паўнату гэтых спісаў і карт;

в) праверыць спісы домаўладанняў і планы гарадоў з тым, каб не было прапускоў дамоў, кватэр і насельніцтва;

г) удасканаліць межы гарадоў і гарадскіх паселішч;
д) правесці падбор і ўкамплектаванне кадраў для перапісу насельніцтва з лепшых удзельнікаў мінулых перапісаў насельніцтва і актыва па выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР;
е) арганізаваць неадкладна камісіі садзейнічання перапісу насельніцтва пры горсоветах і сельсоветах;
ж) арганізаваць тэхвучобу для работнікаў райінспектуры і ўчастковых інспектароў па пытаннях перапісу насельніцтва, праводзячы заняткі не менш як 3 разы ў месяц;
з) скласці раённыя оргпланы правядзення перапісу насельніцтва і прадставіць іх у абл. УНГУ ў тэрмін, устаноўлены УНГУ БССР і абл. УНГУ;
і) забяспечыць праз раённыя кіруючыя арганізацыі правядзенне масавай растлумачальнай работы па перапісу насельніцтва;
к) правесці своечасова інструктаж масавых кадраў па перапісу насельніцтва і забяспечыць іх інструктажам перапісу.

4. Забяспечыць своечасовае і добраякаснае выкананне ўсіх іншых работ, правадзімых райінспектурамі (квартальны ўчот па працы і зарплаце, справаздачнасць па будаўніцтву, учот натуральнага і механічнага руху насельніцтва і інш.).

5. Весці рашучую барацьбу з скажэннямі і вочкаўціраць цельствам ва ўсіх галінах учота, а таксама з парушэннем устаноўленых форм і тэрмінаў учота і справаздачнасці.

6. Асвятляць у раённым друку ход правадзімых райінспектурамі работ, асабліва па ўчоту пасеўных плошчаў і падрыхтоўцы да перапісу насельніцтва.

7. Разгарнуць соцспаборніцтва на лепшае правядзенне паказаных вышэй работ паміж раённымі і ўчастковымі інспектарамі наргасучота, сельсоветамі, калгасамі і ўдзельнікамі правадзімых работ.

Па ўсіх вышэйпаказаных пунктах выклікаем на соцспаборніцтва райінспектуры наргасучота Гомельскай вобласці.

Арбітрам просім быць Упраўленне наргасучота БССР.

По даручэнню нарады райінспектароў Палескай вобласці:
Фішкінд, Пехота, Жылінскі.

2-га чэрвеня 1938 г.

Райінспектурам і Ўпраўленню наргасучота Палескай вобласці

Мы, райінспектары наргасучота Гомельскай вобласці і работнікі Гомельскага абл. УНГУ, заслухаўшы і абгаварыўшы выклік работнікаў наргасучота Палескай вобласці, прымаем прысланы соцдагавор і з свайго боку бярэм на сябе наступныя дадатковыя абавязацельствы і ўносім дадаткова наступныя пункты:

1. К п. 1 „д“. Дабіцца поўнага выяўлення ўсіх сартавых пасеваў. Пры выяўленні фактаў адсутнасці дакументаў на сартавыя пасевы—дабіцца атрымання калгасамі дакументаў на іх.

2. К п. 1 „е“. Матэрыял учота пасеўных плошчаў здаць абавязкова з дакладной запіскай, глыбока аналізуючай вынікі ўчота.

3. К п. 1 „ж“. Арганізаваць дапамогу абласнога УНГУ райінспектурам у правядзенні інструктажа па ўчоту пасеўных плошчаў у 50 проц. раёнаў. Праверку работы па ўчоту правесці ва ўсіх раёнах вобласці. Прыёмку матэрыяла ўчота вытварыць на месцы не менш, як у 50 проц. райінспектур.

4. К п. 2—дадаем яшчэ два абзацы:

Усю работу па вызначэнню відаў на ўраджай участковымі інспектарамі вытвараць абавязкова з шырокім удзелам калгаснікаў—стаханаўцаў, брыгадзіраў і г. д.

Дабівацца 100-процантнага прадстаўлення калгасамі картак ф. 8 аб відах на ўраджай у райЗА.

5. К п. 2 „а“ уносім пункт:

Праверыць у райЗА становішча і ход падрыхтоўчых работ да перапісу пародзістай жывёлы.

Па атрыманні бланкаў перапісу пародзістай жывёлы з УНГУ БССР забяспечыць на працягу 2-х дзён рассылку бланкаў у раёны.

Прыняць актыўны ўдзел у інструктажы воатэхнікаў.

6. Па п. п. 3 „з“, „і“ і „к“ лічым неабходным заключэнне самастойных канкрэтных умоў пасля зацверджання ўрадам праграмы і парадку правядзення перапісу.

По даручэнню: **Кулікаў, Томберг, Марусік, Ліберман.**

15 чэрвеня 1938 года, г. Гомель.

ДАГАВОР

на соцыялістычнае спаборніцтва паміж Полацкай і Віцебскай горінспектурамі наргасучота па правядзенню падрыхтоўчых работ да ўсесаюзнага перапісу насельніцтва 1939 года і правядзенню самога перапісу

Улічваючы ўсю важнасць і гаспадарча-палітычнае значэнне прадстаячага ўсесаюзнага перапісу насельніцтва 1939 года і маючы на ўвазе, што высокая якасць падрыхтоўчых работ з'яўляецца адной з асноўных умоў паспяховага правядзення перапісу насельніцтва, мы, работнікі Полацкай горінспектуры наргасучота, уключаемся ў соцспа-

борніцтва, выклікаем Віцебскую горінспектуру і канкрэтна бярэм на сябе наступныя абавязацельствы:

1. Забяспечыць выдатную якасць, у сэнсе паўнаты і дасканальнасці, спісаў домаўладанняў і ўсяго картаграфічнага матэрыяла, правёўшы поўную выверку.

2. Своечасова арганізаваць і ўзорна прывесці інструктаж масавых кадраў перапісу насельніцтва ў горадзе.

3. Забяспечыць сістэматычны нагляд за складам населеных месц горада і кантроль за своечасовым унясеннем змен па складу насельніцтва ў спісы домаўладанняў.

4. У мэтах удасканалення картаграфічнага матэрыяла горада (кварталаў) у лістападзе месяцы 1938 года паўторна праверыць правільнасць складзеных спісаў домаўладанняў горада шляхам суцэльнага абхода ўсіх кварталаў домаўладанняў.

5. Своечасова і па якасці не ніжэй як на „добра" праводзіць усе падрыхтоўчыя работы па перапісу.

6. Забяспечыць добрае і своечасовае разгортванне сярод насельніцтва масавай палітычнай работы па растлумачэнню задач, стаячых па правядзенню перапісу насельніцтва, забяспечыць правядзенне сходаў, гутарак і г. д. у кожным прадпрыемстве, школе; таксама забяспечыць 100-працантны ахоп неарганізаванага насельніцтва (хатніх гаспадынь).

7. Зараз приступіць да падбора перапісных кадраў з тым, каб удзельнікі перапісу насельніцтва былі праверaны як з палітычнага, так і дзелавога боку, не дапушчаючы да гэтай важнейшай кампаніі ні аднаго ненадзейнага работніка.

8. Перапіс насельніцтва правесці на „выдатна" і ўсе матэрыялы па перапісу насельніцтва здаць абл. УНГУ ва ўстаноўленыя ўрадам тэрміны.

Дагавор гэты мае дзейснасць да канца ўсесаюзнага перапісу насельніцтва і здачы матэрыялаў.

Арбітрам просім быць бюро перапісу УНГУ БССР і Віцебскае абл. УНГУ.

Горінспектар НГУ Баўтовіч.
Эканаміст-статыстык Дук.

Мы, работнікі Віцебскай горінспектуры наргасучота, абгаварыўшы выклік Полацкай горінспектуры на соцспаборніцтва на лепшае правядзенне падрыхтоўчых работ да ўсесаюзнага перапісу насельніцтва 1939 года і правядзенне самаго перапісу, прымаем яго поўнасцю.

Ч.в.а. горінспектара НГУ—Ваўчок.
Ст. эканаміст—Гарбаценкава.
Эканаміст—Хмыльнікава.
Эканаміст—Вайнштэйн.
Статыстык—Свяцкая.

ЗАГАД № 331

па Ўпраўленню народна-гаспадарчага ўчота БССР

5 чэрвеня 1938 г.

На апошняй нарадзе раённых інспектароў, якая адбылася 2/VI 1938 г., высветлілася, што некаторыя начальнікі і кіраўнікі груп несвоечасова рэагуюць на ўсялякага рода пісьмы і заявы, дасылаемыя ў рэспубліканскае УНГУ работнікамі раённых інспектур наргасучота.

Такое становішча сведчыць аб тым, што справа разбора заяў і скарг у рэспуб. УНГУ і абл. УНГУ знаходзіцца не на належнай вышыні і што гэтаму пытанню не ўдзяляецца дастатковай увагі. Пагэтаму, у мэтах зжыцця бюракратычнага падыхода да патрэб і запытанняў работнікаў перыферыі, загадваю:

1. Усім начальнікам аддзелаў і кіраўнікам груп рэспуб. УНГУ і абл. УНГУ на ўсе запытанні работнікаў інспектур адказваць не пазней як праз 2 дні.

2. Начальнікам аддзелаў і кіраўнікам груп рэсп. УНГУ і абл. УНГУ завесці такі парадак, пры якім усе паступаючыя запытанні своечасова рэгістраваліся-б і браліся-б пад кантроль да канчатковага вырашэння пытання.

3. Усім начальнікам абл. УНГУ справу паступлення скарг ад работнікаў раённых інспектур арганізаваць з такім разлікам, каб у абл. УНГУ яны пападалі непасрэдна начальніку абл. УНГУ, а ў рэсп. УНГУ ва ўчотную інспекцыю.

4. Пры ўстанаўленні фактаў ігнаравання асобнымі работнікамі запытанняў і скарг інспектароў, а таксама і інш. карэспандэнцыі альбо бюракратычнай адпіскі замест прамога адказа па сутнасці—вінаватыя будуць прыцягвацца да адказнасці.

В. а. начальніка Упраўлення Наргасучота БССР **Абудзееў.**

ЗАГАД № 176

па Цэнтральнаму ўпраўленню народна-гаспадарчага ўчота Дзяржплана СССР

ад 21 сакавіка 1938 года.

У мэтах умацавання дзяржаўнай дысцыпліны і павышэння адказнасці начальнікаў УНГУ за становішча спраў УНГУ і захаванне соцыялістычнай уласнасці загадваю:

1. Пры змене начальнікаў УНГУ саюзных рэспублік здача спраў павінна вытварацца ранейшым кіраўніцтвам, новаму з удзелам прадстаўніка ЦУНХУ пры складанні прыёма-здатачнага акта, а пры змене начальнікаў абласных (краявых) УНГУ—пры ўдзеле прадстаўніка УНГУ адпаведнай рэспублікі.

2. Начальнікам УНГУ краёў і абласцей устанавіць, што пры змене рай(гор.)інспектароў наргасучота складаюцца прыёма-здатачныя акты аб становішчы спраў і маёмасці райінспектуры.

Для ўдзелу ў складанні прыёма-здатачнага акта начальнікі УНГУ абавязаны камандыраваць у райінспектуру свайго прадстаўніка.

Прыёма-здатачныя акты райінспектур зацвярджаюцца начальнікам УНГУ.

3. Акты прыёма-здачы спраў павінны змяшчаць выкананне плана ўчотна-статыстычных работ па аддзелах (сектарах), становішча кадраў і характарыстыку гаспадарчага і фінансавага становішча і становішча касы і перадаваемай маёмасці.

4. Акт падпісваецца здаючым і прымаючым справы, а таксама прадстаўніком, прысутнічаючым пры перадачы спраў.

У тых выпадках, калі здаючы ці ўноў прызначаны начальнік маюць па асобных артыкулах акта супярэчанні, яны выкладаюць іх у пісьмовай форме пры падпісанні акта.

5. У выпадку выяўлення пры прыёме спраў буйных злоўжыванняў і безгаспадарчасці, новы начальнік УНГУ ставіць перад начальнікам УНГУ саюзнай рэспублікі ці ЦУНХУ—па прыналежнасці—пытанне аб прызначэнні спецыяльнай дакумантальнай рэвізіі і інвентарызацыі маёмасці.

6. Да прыёма-здатачнага акта прыкладаецца заключэнне прадстаўніка, прысутнічаючага пры перадачы спраў, у якім ён дае агульную характарыстыку становішча УНГУ, ацэнку работы папярэдняга начальніка і свае прапановы аб неабходных мерапрыемствах.

7. Перад падпісаннем прыёма-здатачнага акта праводзіцца сход актыва, на якім абгаварваюцца асноўныя вывады і лічбовыя даныя, запісаныя ў акце.

Фактычныя даныя, выявіўшыяся пры абмеркаванні на актыве, пасля праверкі іх заносяцца ў акт.

8. Прыёмка-здача спраў павінна быць скончана не пазней двух дэкад з дня выдання загада аб змене начальніка УНГУ.

9. Начальнікі УНГУ саюзных рэспублік абавязаны асабіста разгледзець акт прыёма-здачы спраў і не пазней месячнага тэрміна зацвердзіць мерапрыемствы па ліквідацыі

адзначаных у акце недахопаў і скажэнняў па забеспячэнню выканання плана, таксама прыцягнуць да адказнасці вінаватых, якія дапусцілі скажэнні, злоўжыванні і безгаспадарчасць.

Начальнік ЦУНХУ Дзяржплана СССР І. Сауцін.

ЗАГАД № 341

па Ўпраўленню народна-гаспадарчага ўчота БССР

ад 13/VI 1938 г.

§ 1.

Пам. нач. УНГУ БССР па кадрах т. Фарберу да 15 чэрвеня перадаць асабовыя справы на ўсіх участковых інспектароў абласным УНГУ.

§ 2.

З 15 чэрвеня аслабаненне і зацверджанне ўчастковых інспектароў, эканамістаў і статыстыкаў раінспектур ускласці на начальнікаў абл. УНГУ.

§ 3.

Раінспектарам матэрыял па прыёму і звальненню работнікаў, паказаных у § 2 загада, непасрэдна накіроўваць начальніку абл. УНГУ.

§ 4.

Начальнікам абл. УНГУ аб усіх зменах у апараце раінспектур неадкладна паведамляць у аддзел кадраў УНГУ БССР.

В. а. начальніка Ўпраўлення Наргасучота БССР Абудзееў.

ЗАГАД № 333

па Ўпраўленню народна-гаспадарчага ўчота БССР

ад 9/VI 1938 г.

За лепшыя ўзоры большэвіцкай барацьбы ў справе ажыццяўлення заданняў партыі і ўрада па правядзенню перапісу жывёлы на 1/І 1938 года прэміраваць наступных работнікаў сістэмы УНГУ БССР:

1. Райінспектара Чашніцкага раёна т. **Ялава**—месячным акладам (400 руб.).

2. Быўшага ўчастковага інспектара Свяцілавіцкага раёна т. **Рафаленак** (зараз працуючага райінспектарам Лоеўскага раёна)—грашовай прэміяй у суме 325 руб.

3. Быўшага райінспектара Лагойскага раёна т. **Абражэвіча** (зараз працуючага нам. нач. Менскага абл. УНГУ)—грашовай прэміяй у суме 500 руб.

4. Учінспектара Уздзенскага раёна т. **Трухана**—месячным акладам (325 руб).

5. Учінспектара Бешанковіцкага раёна т. **Халуй**—месячным акладам (325 руб.).

6. Учінспектара Касцюковіцкага раёна т. **Ермакова С. Г.**—месячным акладам (325 руб.).

7. Учінспектара Уваравіцкага раёна т. **Цытарэнко**—месячным акладам (325 руб.).

8. Учінспектара Жлобінскага раёна т. **Берэснева О. Ц.**—грашовай прэміяй у суме 250 руб.

9. Учінспектара Аршанскага раёна т. **Сенчук**—грашовай прэміяй у суме 250 руб.

10. Старшага эканаміста с/г аддзела т. **Шафраноўскую**—грашовай прэміяй у суме 275 руб.

В. а. начальніка Ўпраўлення Наргасучота БССР Абудзееў.

ЗАГАД № 18

па Палескаму абласному ўпраўленню наргасучота

24 чэрвеня 1938 года.

Участковыя інспектары наргасучота Нараўлянскага раёна т. т. Семешчэнка і Нецяжэнка, закончыўшы ацэнку відаў на ўраджай па кантраліруемых калгасах, перасланлі матэрыял у райінспектуру праз выпадковых асоб, у выніку чаго матэрыял па ўчастку Семешчэнка зусім прапаў, а па ўчастку Нецяжэнка папаў у райіспектуру з вялікім спазненнем.

Такія ўчынкі з боку Семешчэнка і Нецяжэнка можна расцэньваць толькі як факты палітычнай бясклопатнасці і самых безадказных адносін да захавання службовай перапіскі.

На падставе адзначанага абвяшчаю вымову ўчастковаму інспектару Семешчэнка і стаўлю на від т. Нецяжэнка.

Папярэджваю ўсіх раённых і ўчастковых інспектароў, а таксама і ўсіх астатніх работнікаў сістэмы наргасучота па Палескай вобласці, што пры паўтарэнні такіх выпадкаў вінаўныя будуць прыцягвацца мною да суровай адказнасці.

Начальнік Палескага абл. УНГУ Фішкінд.

ЗАГАД № 801

па Народнаму Камісарыяту Земляробства БССР

ад 31 мая 1938 года.

За самачыннае ўключэнне Бярэзінскім райЗА ў калгасную зводку сяўбы на 10/V 1938 года даных аб пасеве калгаснікаў і аднаасобнікаў у колькасці 4720 га, што павялічыла выкананне сяўбы супроць сапраўднасці на 22,5 проц., загадчыку райЗА гэтага раёна тав. ГУРЭВІЧ абвяшчаю суровую вымову з папярэджаннем.

Папярэджваю ўсіх загадчыкаў райЗА, што пры паўтарэнні такіх выпадкаў да віноўных буду ўжываць самыя суровыя меры пакарання.

Нарком Земляробства БССР **Свінцоў.**

Усім абласным УНГУ

